«Давай, давай, забівай! Вы што, забыліся, у якой краіне жывяце?»

Опубликовано: 2023-06-19. | Время чтения: ~2 минуты.



«Давай, давай, забівай! Вы што, забыліся, у якой краіне жывяце?»

Грамадскае расследаванне катаванняў у Савецкім РУУС 9-13 жніўня 2020.

З 9 па 13 жніўня 2020 года ў Савецкае РУУС прывозілі людзей, якія былі затрыманыя на мірных пратэстах у цэнтры Мінска. Нароўні з Акрэсціна, гэта адно з самых жорсткіх месцаў зняволення. За гэтыя 4 дні праз Савецкае РУУС прайшло **400-600 чалавек**. Сілавікі забіралі ўсіх без разбору — сярод затрыманых апынуўся нават грамадзянін Ізраіля.

Умовы ўтрымання былі настолькі зверскімі, што некаторыя са сведкаў параўноўваюць РУУС з фашысцкім канцлагерам. Вось, што распавядалі людзі:

- *«... Хадзілі з аўтаматамі. Адчуванне было, што трапіў у канцлагер. Тузалі затворы аўтаматаў і пагражалі расстраляць усіх, калі хоць хтосьці пабяжыць».*
- *«Там было вельмі шмат людзей, якіх не проста білі, а калечылі. Іх цягалі па зямлі, за рукі, быццам целы мёртвых. Яны былі акрываўленыя. Адцягнуўшы ў бок, аблівалі вадой і зноў білі. Крыкі былі жудасныя!»*
- *«Перыядычна забіралі ў аддзел. Уключалі камеру, кажуць: «Ты, сука, АМАП хацеў спаліць?». Ты кажаш: «Не». Тады яны выключаюць, пачынаюць цябе біць. Потым паўтараюць пытанне, зноў уключаюць камеру, і ты ўжо адпаведна адказваеш: «Так, я там быў, я хацеў спаліць, я там хацеў...».*

Гэты дакумент — чарговае грамадскае расследаванне Прававой ініцыятывы і Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі. Наша мэта — правесці расследаванне па кожным РУУС. Мы хочам выразна ведаць, што менавіта адбывалася ў месцах затрымання ў пачатку жніўня і хто ў гэтым вінаваты.

Для гэтага расследавання мы вывучылі 52 задакументаваныя намі гісторыі. Гэта **568 старонак тэксту і 137 старонак медыцынскіх даведак і дакументаў**. На падставе гэтых матэрыялаў мы склалі храналогію падзей і правялі апазнанне сілавікоў, спрычыненых да катаванняў. Спіс фота і імёнаў патэнцыйных злачынцаў вы можаце знайсці ў канцы дакумента.

ВАЖНА! Вінаватасць гэтых людзей можа даказаць толькі суд. Мы не заклікаем да гвалту і не выносім прысуд. Наша мэта — паказаць, што рана ці позна нам становіцца вядома пра кожны выпадак катаванняў і жорсткага абыходжання. Мы хочам, каб вы ведалі — мы захоўваем усе доказы. І не дамо рэжыму іх знішчыць. Аднойчы ўсе вінаватыя будуць прыцягнутыя да адказнасці, а нашыя дакументы дапамогуць справядліваму судоваму разбіральніцтву.

За апошнія 3 гады мы **задакументавалі 1718 гісторый** катаванняў. Мы працягваем дакументаваць старыя і новыя выпадкі, і не спынімся, пакуль усе вінаватыя не будуць прыцягнутыя да адказнасці.

ЧЫТАЦЬ ПОЎНУЮ ВЕРСІЮ (https://legin.info/laravel-filemanager/files/shares/Report_Sov_RUVD_BY.pdf)

Расследаванне на:

- Беларускай мове (https://legin.info/laravel-filemanager/files/shares/Report_Sov_RUVD_BY.pdf)
- Рускай мове (https://legin.info/laravel-filemanager/files/shares/Report_Sov_RUVD_RU.pdf)
- Ангельскай мове (https://legin.info/laravel-filemanager/files/shares/Report_Sov_RUVD_EN.pdf)

Назад (https://legin.info)

Поделиться: (https://vk.com/share.php?url=https%3A%2F%2Flegin.info%2Fposts%2Fsovetskoye-ruvd) (https://www.facebook.com/sharer/sharer.php?u=https%3A%2F%2Flegin.info%2Fposts%2Fsovetskoye-ruvd) (https://twitter.com/home?status=https%3A%2F%2Flegin.info%2Fposts%2Fsovetskoye-ruvd) (https://connect.ok.ru/offer?url=https%3A%2F%2Flegin.info%2Fposts%2Fsovetskoye-ruvd)

Подписка на рассылку

Email адрес

Подписаться

Новости по теме

Набор на КиноТренинг «Неигровое кино по правам человека» (https://legin.info/posts/kinorening-neigrovoe-kino-po-pravam-chelovekat)

Право на протест: преследование религиозных деятелей (https://legin.info/posts/397)


Право на протест: преследование беларусов за донаты (https://legin.info/posts/396)

Патрабуем правесці аб'ектыўнае расследаванне смерці Алеся Пушкіна (https://legin.info/posts/395)


КиноТренинг «Создание фильма о правах человека» (https://legin.info/posts/kinotrenin-sozdanie-filma-o-pravah-cheloveka)

Поддержите нас


(https://www.patreon.com/legal_initiative)



(https://www.youtube.com/channel/UCGMHqfDLVEAHNOmtHVMWuiA)



(https://game.legin.info/quiz)



(https://torturesbelarus2020.org)

Читайте нас в Telegram

(https://t.me/legal_initiative)

Темы новостей сайта

ИВС (Https://Legin.Info/Tags/Ivs)
ОМОН (Https://Legin.Info/Tags/Omon)
Заявления (Https://Legin.Info/Tags/Zayavleniya)
Подкасты (Https://Legin.Info/Tags/Podkasti)
ООН (Https://Legin.Info/Tags/Oon)
Прокуратура (Https://Legin.Info/Tags/Prokuratura)
Видеоролик (Https://Legin.Info/Tags/Video)
Психологическое Давление (Https://Legin.Info/Tags/Psihologicheskoe-Davlenie)
Школа (Https://Legin.Info/Tags/Shkola)
Условия Содержания (Https://Legin.Info/Tags/Usloviya-Soderzhaniya)
ГУБОПиК (Https://Legin.Info/Tags/Gubopik)
Конституционный Суд (Https://Legin.Info/Tags/Konstitutsionnii-Sud-)
Преступления Против Человечности (Https://Legin.Info/Tags/Prestupleniya-Protiv-Chelovechnosti)
МВД (Https://Legin.Info/Tags/Mvd)
Конференция (Https://Legin.Info/Tags/Konferentsiya)

Разделы сайта

- О нас (https://legin.info/about)
- Новости (https://legin.info/posts)
- Курсы (https://legin.info/courses)
- Документы (https://legin.info/documents)
- Фильмы (https://game.legin.info/movie)
- Карта сайта (https://legin.info/map)

Наша деятельность

- Образовательная деятельность (https://legin.info/activity/education)
- Просветительство (https://legin.info/activity/enlightenment)
- Документирование пыток (https://torturesbelarus2020.org/)
- Неделя против пыток (https://protivpytok.org/programma-nedeli-protiv-pytok-2022.html)

Юридически

мы зарегистрированы в Литве:

№305806589
VšĮ "Teisinė iniciatyva"
Vilnius, Kalvarijų g. 125 LT-08221
Lithuania

Связаться с нами

lirngo@gmail.com (mailto:lirngo@gmail.com)

(https://www.facebook.com/belarusLI) (https://www.youtube.com/channel/UCGMHqfDLVEAHNOmtHVMWuiA) (https://twitter.com/leginby) (https://t.me/pravovaya_initsiativa) (https://www.instagram.com/legal_initiative_belarus/)

© «**Правовая инициатива**», 1996-2023 г., www.legin.info (https://legin.info). | При использовании материалов сайта активная гиперссылка на источник обязательна.